**Н. А. Ляйко,** *прафесар*
*кафедры інфармацыйных рэсурсаў,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
**А. І. Фядорына,** *дацэнт*
*кафедры інфармацыйных рэсурсаў*

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КУРСА «КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ» ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ФАКУЛЬТЭТА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Дзяржаўнай праграме развіцця вышэйшай адукацыі на 2011–2015 гады [2] вызначаны асноўныя кірункі развіцця сучаснай вышэйшай школы і абазначаны прыярытэты падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у адпаведнасці са стратэгіяй сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Дакументы прадугледжваюць удасканаленне арганізацыйнага і навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу, які ўключае падрыхтоўку тэкстаў лекцый, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных выданняў. Пэўная ўвага ў іх надаецца вучэбна-метадычным комплексам (ВМК), якія садзейнічаюць удасканаленню і развіццю вучэбнага працэсу.

На сучасным этапе роля навукова-метадычнага забеспячэння значна ўзрасла ў сувязі са скарачэннем курсаў і пераводам значнай колькасці вучэбных гадзін на самастойную работу студэнтаў. Навукова-метадычнае забеспячэнне ў сферы адукацыі ажыццяўляецца з мэтай павышэння яе якасці і грунтуецца на выніках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі ўключае: вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм, праграмна-планіровачную дакументацыю па выхаванні, вучэбна-метадычную дакументацыю, вучэбныя выданні, інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы [1, с. 94].

Структурныя элементы навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі па ўзроўнях асноўнай адукацыі могуць аб’ядноўвацца ў ВМК. Комплекснае навукова-метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу – гэта планаванне, распрацоўка і стварэнне аптымальнай сістэмы (комплекса) вучэбна-метадычнай дакументацыі і вучэбна-метадычных сродкаў навучання. Яны неабходны для якаснай прафесійнай адукацыі ў сучасных умовах, адпаведных вучэбных планаў і праграм прадмета. Распрацоўка вучэбных комплексаў ажыццяўляецца па пэўных крытэрыях:

– комплекс вучэбна-метадычнай дакументацыі павінен ахоплівацъ асноўны змест праграмнага матэрыялу. Пад комплекснасцю разумеецца, што вывучэнне кожнага пытання па кожнай тэме вучэбнай праграмы забяспечваецца неабходным аптымальным мінімумам вучэбнай і вучэбна-метадычнай дакументацыі і сродкамі навучання;

– комплекснае забеспячэнне вучэбнага працэсу сродкамі навучання – гэта ўлік іх галоўных функцый і магчымасцей выканання ў тыповых вучэбных сітуацыях;

– комплексны падыход да забеспячэння вучэбнага працэсу патрабуе, каб вучэбна-метадычная дакументацыя і сродкі навучання ў комплексе садзейнічалі рэалізацыі асноўных функцый вучэбнага працэсу – навучання, развіцця і выхавання;

– комплекснасць у дыдактычным забеспячэнні вучэбнага працэсу прадугледжвае рэалізацыю праз вучэбна-метадычную дакументацыю і сродкі навучання ўсіх асноўных этапаў педагагічнага працэсу.

Комплекснае забеспячэнне вучэбнага працэсу – адзін з важнейшых шляхоў павышэння якасці адукацыі ў вышэйшай школе. Ён дае магчымасць выкладчыку паслядоўна размясціць тэматыку курса і прадставіць яго ў цэлым, больш шырока выкарыстаць наглядны матэрыял, атрымаць поўную інфармацыю аб асновах будучай прафесійнай дзейнасці.

Улічваючы сутнасць комплексу, яго назначэнне і патрабаванні, намі быў распрацаваны ВМК для студэнтаў ФЗН па дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў». У дадзеным выпадку мы будзем разглядаць яго прызначэнне і эфектыўнасць выкарыстання на ФЗН студэнтамі, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю. ВМК уключае не толькі абавязковыя структурныя элементы, такія як тэматычны план і праграма курса; метадычныя рэкамендацыі і тэмы практычных і лабараторных заняткаў з указаннем зместу работы і асаблівасцей правядзення заняткаў па кожнай канкрэтнай тэме; метадычныя ўказанні і тэмы кантрольных работ; тэматыка курсавых і дыпломных работ; спіс літаратуры па курсу; пытанні да заліку і экзамену, але і іншыя дадатковыя матэрыялы, якія садзейнічаюць павышэнню якасці адукацыі, таму выкарыстоўваюцца намі як актыўныя метады навучання.

Значная ўвага сярод актыўных метадаў навучання на ФЗН належыць лекцыі. На сучасным этапе адбываецца трансфармацыя традыцыйнай лекцыі як спосабу перадачы гатовых ведаў педагога ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маналагічнай форме гутаркі. Да новых форм адносяцца кампьютарныя лекцыі, лекцыі праблемнага характару, лекцыі ўдваіх, лекцыі з раней запланаванымі памылкамі [4, с.175].

Пэўная роля пры вывучэнні курса заўсёды належыць уводнай лекцыі. Студэнты ФЗН, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, некаторыя працэсы каталагізацыі дакументаў вывучалі ў Магілёўскім бібліятэчным каледжы імя А. С. Пушкіна. Таму ўводная лекцыя ў гэтых групах пачынаецца не з разгляду пытанняў аб ролі курса і яго месцы сярод бібліятэказнаўчых і бібліяграфазнаўчых дысцыплін, яго значэнні ў практычнай дзейнасці, а з лекцыі аб суадносінах курсаў «Каталагізацыя дакументаў» і «Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў», з выяўлення ведаў студэнтаў, якія яны атрымалі па дадзенай дысцыпліне ў каледжы.

Аналізуючы праграму каледжа і веды студэнтаў, заўважым, што ёсць значная розніца ў вучэбных планах і праграмах. У прыватнасці, у курсе «Арганізацыя бібліятэчных фондаў і каталогаў» не прадугледжана вывучэнне тэарэтычных асноў індэксавання дакументаў, адпаведных інфармацыйна-пошукавых моў, недастаткова разглядаюцца пытанні стандартызацыі ў галіне каталагізацыі, не вывучаюцца табліцы УДК і прадметызацыя дакументаў, арганізацыя прадметнага і электроннага каталогаў, фарміраванне бібліяграфічнага запісу ў камунікатыўным BELMARC-фармаце з выкарыстаннем аўтарытэтнага/нарматыўнага кантролю, арганізацыя зводнага электроннага каталогу бібліятэк Беларусі і інш. Мы стараемся захоўваць пераемнасць адукацыі, уключаем у праграмы, ВМК і ўсе віды заняткаў пералічаныя вышэй тэмы. Для гэтага выкарыстоўваем не толькі новы змест, але і методыку навучання.

Са студэнтамі, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, можна выкарыстоўваць розныя вышэйназваныя формы лекцый. Нам падаецца, што пры правядзенні лекцый і практычных заняткаў для лепшага засваення мэтазгодна даваць інфармацыю ў структурна-лагічнай форме, якая можа быць у выглядзе табліц, схем або прэзентацый. Дапаўненне такімі матэрыяламі лекцыйнага тэксту актывізуе мысленне студэнтаў, лепш успрымаецца, дае большы эфект ад лекцыі. У нашым ВМК, як і ў вучэбным дапаможніку «Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў», такія матэрыялы даюцца ў выглядзе дадаткаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Структура ББК», «Структура УДК», «Табліца знакаў УДК» і інш. [3]. Візуалізацыя інфармацыі садзейнічае больш глыбокаму засваенню адпаведных тэм. Яны складаюць аснову працэсу запамінання, актывізуюць самастойную работу студэнтаў. Лепшыя вынікі дасягаюцца пры спалучэнні тэкставага і структурна-лагічнага матэрыялу ў час лекцыйных, практычных і лабараторных заняткаў.

У значнай ступені гэтаму садзейнічае таксама гласарый да курса або асобных тэм, у прыватнасці, па тэмах «Тэарэтычныя асновы індэксавання дакументаў», «УДК», прэзентацыі аб жыцці і дзейнасці знакамітых вучоных у дадзенай галіне (Мелвіл Дз'юі, Поль Атле і Анры Лафантэн, Э. Р. Сукіасян і інш.).

Рыхтаваць творчую асобу магчыма толькі пры вырашэнні крэатыўных задач, таму практычныя заняткі па курсу «Каталагізацыя дакументаў» па тэме «Вызначэнне якасці каталогаў і эфектыўнасці іх выкарыстання» праводзяцца ў форме дзелавой гульні. На наш погляд, дзелавая гульня прыцягвае студэнтаў, выклікае цікавасць да выканання задання, імкненне да актыўнага выкарыстання ведаў. Эфектыўнасць дзелавой гульні ў многім абумоўлена тым, што яна праводзілася ў бібліятэках: БДУКМ, БелСХБ, ЦГДБ, на прыкладзе якіх вызначалася якасць сістэматычнага каталогу і алфавітна-прадметнага паказальніка. Пры вызначэнні тэматыкі для ажыццяўлення пошуку падбіраліся актуальныя тэмы, па якіх звычайна больш за ўсё бывае запытаў. Наша дзелавая гульня надрукавана на ратапрынце, але яна пастаянна абнаўляецца, дапаўняецца новымі тэмамі з улікам тыпу бібліятэкі – бібліятэкі ВНУ, рэспубліканскай сельскагаспадарчай бібліятэкі або дзіцячай. На сучасным этапе яна дапаўняецца новымі матэрыяламі, звязанымі з ажыццяўленнем пошуку як у традыцыйных інфармацыйна-пошукавых сістэмах, так і электронным каталогу (ЭК). Студэнты самастойна прыходзяць да высновы, што ЭК трэба разглядаць не толькі як форму, але і як від, таму што ў ім можна знайсці вядомага аўтара, падабраць літаратуру па пэўнай тэме або праблеме, гэта значыць, што ён можа замяніць не толькі алфавітны і сістэматычны каталогі, але і прадметны. Студэнты правільна ацэньваюць эфектыўнасць выкарыстання кожнага з каталогаў і робяць правільныя вывады аб іх перспектывах. Правядзенне дзелавой гульні дапамагае выкладчыку ўсебакова ацаніць веды студэнтаў па тэме, выявіць іх уменні і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навыкі, якія яны атрымалі на занятках і ў час практычнай дзейнасці ў сваёй бібліятэцы.

Вышэйсказанае сведчыць аб тым, што для ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на факультэце завочнага навучання па курсу «Каталагізацыя дакументаў», на наш погляд, мэтазгодна звярнуць увагу на:

– вывучэнне курса «Каталагізацыя дакументаў» дапоўніць дысцыплінай спецыялізацыі «Машыначытальная каталагізацыя»;

– выданне трэцяй часткі вучэбнага дапаможніка па курсу «Каталагізацыя дакументаў. Бібліятэчныя каталогі як інфармацыйна-пошукавыя сістэмы»;

– садзейнічанне развіццю вучэбнага энтузіязму, фарміраванне ведаў і спецыяльных уменняў студэнтаў;

– выкарыстанне інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, якія ўтрымліваюць звесткі параўнальнай і аналітычнай інфармацыі аб функцыянаванні і перспектывах развіцця сучасных інфармацыйна-пошукавых сістэм.

---


1. *Кодекс* Республики Беларусь об образовании. – URL : http: // www. pravo.by.

2. *Об утверждении* Государственной программы развития высшего образования на 2011–2015 годы: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июля 2011, №893. – URL : http: // pravo.by.

3. *Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэб. дапам. для студ. спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» вышэйшых навучальных устаноў / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., са змян. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 114 с.

4. *Цыркун, И. И.* Инновационное образование педагога : на пути к профессиональному творчеству : учеб.-метод. пособие для студ. высш. учеб. заведений, обучающихся по пед. специальностям 1-08 80-02 «Теория и методика обучения и воспитания учащихся и студенческой молодежи»; 1-08 80-06 «Общая педагогика, история педагогики и образования» / И. И. Цыркун, Е. И. Карпович. – 2-е изд. – Минск, 2011. – 310 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ